ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар установы адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны
ўніверсітэт імя Максіма Танка»
А.І. Жук
20 студзеня 2025 г.

**ВОДЗЫЎ**
апаніруючай арганізацыі на дысертацыю
Косцінай Жанны Вячаславаўны "Эстэтычны ідэал
літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя", прадстаўленую
на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура.

**1. Адпаведнасць зместу дысертацыі заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі.**

Дысертацыя Ж.В. Косцінай "Эстэтычны ідэал літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя" з'яўляецца самастойнай кваліфікацыйнай навуковай работай, адпавядае галіне навукі (філалагічныя навукі), па якой яна прадстаўлена да абароны, і спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура, а таксама патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь, якія прад'яўляюцца да дысертацый на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

**2. Навуковы ўклад саіскальніка ў вырашэнне навуковай задачы з ацэнкай яе значнасці.**

Дысертацыя Косцінай Жанны Вячаславаўны "Эстэтычны ідэал літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя" з'яўляецца актуальным і наватарскім даследаваннем у сучасным беларускім літаратуразнаўстве.

Актуальнасць дысертацыі абумоўлена грамадска-культурнымі, гісторыка-літаратурнымі, тэарэтыка-метадалагічнымі аспектамі. У сучасным грамадстве адбываецца ўскладненне сацыяльных і тэхналагічных працэсаў, што можа прыводзіць чалавека да дэзарыентацыі ў каштоўнасных арыенцірах, у прагназаванні верагоднай будучыні, таму тэма даследавання набывае павышаную значнасць.

Эстэтычны ідэал як літаратуразнаўчая катэгорыя стаў разглядацца параўнальна нядаўна, доўгі час ён вывучаўся як паняцце эстэтыкі і філасофіі (у працах айчынных і замежных даследчыкаў Ю. Борава, М. Кагана, У. Конана, А. Лосева, Л. Сталовіча, А. Мігунова, В. Шастакова і інш.). Навуковы ўклад саіскальніка заключаецца ў тым, што яна паспяхова рэлятывізуе паняцце эстэтычнага ідэалу з філасофіі мастацтва ў літаратуразнаўства, вызначае характарыстыкі і складнікі гэтага феномена, інакш кажучы, Ж.В. Косціна

выпрацоўвае метадалагічны інструментарый у кантэксце міждысцыплінарных сувязяў.

Дысертант паспяхова транспаніруе тры групы эстэтычных катэгорый, прадстаўленых у манаграфіі расійскіх вучоных А. Лосева і В. Шастакова "Гісторыя эстэтычных катэгорый" (1964) у канцэптуальны ўзровень эстэтычнага ідэалу, асэнсаванне якога прадугледжвае *аналіз тэматыкі, праблематыкі, ідэі, пафасу твора*; у паглыблены зварот да мастацкага свету твора і яго структуры, у прыватнасці, *да характарыстыкі персанажаў, пейзажу, хранатопу, суб'екта* мастацкага твора. Трэцяя група катэгорый, якія спрыяюць увасабленню эстэтычнага ідэалу, паводле перакананняя саіскальніка, была звязана са знешняй формай мастацкага твора, да якой адносяцца мова, *жанр, стыль літаратурна-мастацкай адзінкі*.

Наватарскі характар дысертацыі Ж.В. Косцінай праявіўся не толькі ў міждысцыплінарнай метадалагічнай аснове даследавання, але і ў грунтоўнай ацэнцы значнасці крытычных і публіцыстычных работ даследчыкаў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя для ўсведамлення цэласнасці літаратурнага працэсу XIX – XX стагоддзя. Аўтар дысертацыі дэталёва вывучае крытычныя даследаванні Л. Бароўскага, П. Галяньскага, В. Каратынскага, А. Міцкевіча, Р. Падбярэскага, Ю. Славацкага, Э. Славацкага, У. Сыракомлі і іншых мастакоў слова літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя, якія былі актыўнымі рэтранслятарамі эстэтычных прынцыпаў народнага і нацыянальнага ў крытыцы таго часу.

Не выклікае пярэчанняў той факт, што значным навуковым укладам дысертанта ў вырашэнне сфармуляваных задач даследавання стала асэнсаванне рамантычнай іроніі як асноўнага эстэтычнага прынцыпу ў літаратуры Беларусі абазначанага перыяду (глава 2). Ж.В. Косціна вылучыла два ракурсы выяўлення гэтага феномена: як тыпу мастацкага мыслення і як асновы кампазіцыйнай будовы твораў.

Пры асэнсаванні рамантычнай іроніі як тыпу мастацкага мыслення аўтар дысертацыі паспяхова вызначае зыходны момант актуалізацыі іроніі як момант расчаравання ў выніках Вялікай французскай рэвалюцыі і даследуе розныя шляхі яго праяўлення ў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя. Ж.В. Косціна даследуе формы праламлення іранічнага светаадчування *ў псеўдападыхозе да гісторыі* ў аповесці "Не заўсёды так робіцца, як і гаворыцца" Г. Мастоўскай, *у сатырычным стаўленні* да пэўных дзяржаўных дзеячаў, прадстаўленых ва ўспамінах Г. Жавускага ("Успаміны Сапліцы"), І. Ходзькі ("Успаміны квестара", І. Яцкоўскага ("Аповесці з майго часу, альбо Літоўскія прыгоды"), *у прынцыпе двухсветавасці і сімвалічных, шматзначных вобразах* Сына Буры, ката Варгіна і "словах-онімах", якія зафіксаваны ў рамантычным светаадчуванні Я. Баршчэўскага (зборнік "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях").

Рамантычная іронія як аснова кампазіцыі, паводле даследчыцкага бачання, знайшла выяўленне ў супрацьпастаўленні высокіх і нізкіх стыляў у паэме "Тарас на Парнасе" і мастацкіх тэкстах А. Міцкевіча і Я. Баршчэўскага.

Важным для айчыннага літаратуразнаўства з'яўляецца дэталёвае і шматвектарнае даследаванне Ж.В. Косцінай рэпрэзентацыі эстэтычнага ідэалу літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя на канцэптуальным узроўні і ў свеце мастацкай выразнасці літаратурных твораў (глава 3). На багатым ілюстрацыйным матэрыяле твораў Я. Чачота, А. Петрашкевіча, Т. Зана, М. Рукевіча, А. Ходзькі, В. Каратынскага, У. Сыракомлі, Ю.І. Крашэўскага саіскальнік асэнсоўвае адметнасць *духоўна-рэлігійнай праблематыкі* твораў; аналізуе спецыфіку раскрыцця *гісторыка-патрыятычнай тэмы* ў творчасці філаматаў і філарэтаў, Ю. Крашэўскага, асвятляе *вобразы шляхціца, селяніна і паэта* ў мастацкім свеце А. Міцкевіча, В. Дуніна-Марцінкевіча, Я. Баршчэўскага, вылучае *сэнсаўтваральныя эмоцыі* (у паэме "Энеіда навыварат", у паэзіі філаматаў і філарэтаў, у мастацкіх творах А. Міцкевіча, Я. Чачота, У. Сыракомлі і В. Каратынскага).

Вынікам даследавання элементаў прэзентацыі эстэтычнага ідэалу ў літаратуры абазначанага перыяду сталі грунтоўныя высновы пра тое, што крыніцай прыгожага для Я. Чачота з'яўляецца вусная народная творчасць; у творах В. Каратынскага дамінуе матыў пошуку паэтам Бога, гармоніі асабовага ўнутранага свету; грамадзянскі патрыятызм як асноўная эстэтычная каштоўнасць дэманструецца праз вобразна-семантычны рад твораў пісьменнікаў-рамантыкаў і Ю.І. Крашэўскага; дамінуючыя эмоцыі – радасць і смутак служаць асновай адметнага пафасу ў творах патрыятычнай і грамадзянскай тэматыкі (вывады да главы 3).

Даследчыцкай навізной вылучаецца ўспрыманне Ж.В. Косцінай спецыфікі эстэтычнай каштоўнасці слова ў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя. Аналіз мастацкіх тэкстаў выявіў у якасці культурных канстант і сімвалаў прэцэдэнтныя расліны і локусы, якія маюць усеагульнае значэнне. Саіскальнік асэнсоўвае флорасімволіку ў тэкстах літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя у кантэксце еўрапейскай рамантычнай традыцыі і канстатуе, што славутая блакітная кветка пазначана канкрэтным фітонімам: барвенак, васілёк, званочак, незабудка, фіялка, браткі. У паэзіі А. Міцкевіча, Я. Чачота вобразы кветак служаць сродкам рэпрэзентацыі адданага, шчырага сяброўства, кахання, вечнай памяці.

Упершыню ў айчыннай літаратуразнаўчай навуцы праведзена раскрыццё сімвалічнага зместу вобразаў рэк, прадстаўленых у творах А. Міцкевіча (паэма "Конрад Валенрод"), І. Храпавіцкага (верш "Дзвіна"), В. Дуніна-Марцінкевіча (вершаванае апавяданне "З-над Іслачы, або Лекі на сон"), Т. Лады-Заблоцкага (паэма "Званы Віцебска"), якія метафарычна перадаюць перыпетыі лёсу беларускага народа ў канкрэтна-гістарычны час.

Вартасным аспектам дысертацыі Ж.В. Косцінай стала характарыстыка дамінуючых жанраў слоўнага мастацтва выбранага перыяду літаратуры Беларусі як паказчыка дэмакратызацыі мастацкай літаратуры.

У дысертацыі праведзена сістэмнае, цэласнае даследаванне эстэтычнага ідэалу ў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя.

**3. Канкрэтныя навуковыя вынікі (з указаннем іх навізны і практычнай значнасці), за якія саіскальніку можа быць прысуджана навуковая ступень**

Навізна дысертацыі Ж.В. Косцінай вынікае з пастаўленай мэты і задач даследавання, з канкрэтызацыі прадмета яго навуковага аналізу. Аўтар прапанавала ўласную стратэгію вывучэння эстэтычнага ідэалу літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя. Дысертант вызначыла і ахарактарызавала асноўныя складнікі, катэгорыі эстэтычнага ідэалу на канцэптуальным узроўні, у аспектах мастацкага свету і знешняй формы мастацкіх твораў.

Канкрэтнымі навуковымі вынікамі з'яўляюцца наступныя:

1. Сістэматызацыя навуковых канцэпцый замежных і айчынных даследчыкаў пра эстэтычны ідэал. Удакладненне найбольш важных складнікаў эстэтычнага ідэалу;

2. Вызначэнне спецыфічных праяў рамантычнай іроніі як асноўнага эстэтычнага прынцыпу літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя;

3. Выяўленне спосабаў рэпрэзентацыі эстэтычнага ідэалу літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя праз глыбокае даследаванне духоўна-рэлігійнай праблематыкі твораў Я. Чачота і В. Каратынскага; раскрыццё гісторыка-патрыятычнай тэмы ў творчасці філаматаў і філарэтаў, Ю. Крашэўскага; даследаванне вобразаў шляхціца, селяніна і паэта ў мастацкім свеце А. Міцкевіча, В. Дуніна-Марцінкевіча, Я. Баршчэўскага, У. Сыракомлі, В. Каратынскага; вылучэнне сэнсаўтваральных эмоцый (у творах Я. Чачота, А. Міцкевіча);

4. Вылучэнне дамінуючых форм і жанраў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя як стылістычных характарыстык эстэтычнага ідэалу.

Прапанаваныя Ж.В. Косцінай навуковыя ідэі і метадалогія аналізу творчасці пісьменнікаў у аспекце эстэтычнага ідэалу ў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя маюць істотнае значэнне для сучаснага літаратуразнаўства і, несумненна, знойдуць далейшую рэалізацыю ў беларускім даследчым працэсе.

Атрыманыя вынікі, матэрыялы даследавання дысертанта маюць таксама важнае навуковае значэнне для далейшага вывучэння беларускай літаратуры ва УВА і школе. Яны могуць выкарыстоўвацца пры распрацоўцы практычных рэкамендацый і абноўленых стратэгій вывучэння асноўных складнікаў эстэтычнага ідэалу ў беларускай літаратуры, у тым ліку і пры даследаванні набыткаў айчыннай культуры ў славянскім і еўрапейскім кантэксце.

**4. Заўвагі па дысертацыі:**

Даючы станоўчую ацэнку даследаванню Ж.В. Косцінай, варта адзначыць некаторыя яго недахопы:

1. Аб'ектам даследавання Ж.В. Косцінай, паводле матэрыялаў дысертацыі (с. 6), з'яўляюцца мастацкія творы, дакументалістыка, крытычныя працы першай паловы XIX стагоддзя Ю.У. Нямцэвіча, А. Міцкевіча, Я. Ходзькі, А. Гарэцкага, Я. Чачота, Т. Зана, У. Сыракомлі, В. Каратынскага і

інш. Але ў змесце дысертацыі рэдка прыводзяцца імёны Я. Ходзькі, А. Гарэцкага (сс. 4, 98). Імя Ю.У. Нямцэвіча згадваецца адзін раз на с. 108, творы гэтага пісьменніка разгорнута не аналізуюцца. Выклікае пытанне: на якой падставе гэты аўтар быў уключаны ў пералік пісьменнікаў, творчасць якіх стала аб'ектам даследавання?

2. У заключэнні пры падвядзенні асноўных навуковых вынікаў дысертацыі Ж.В. Косціна падагульняе: "Эмоцыю смутку звычайна адносяць да негатыўных, аднак яе частае ўзнаўленне ў творчасці *А. Міцкевіча, А. Петрашкевіча, Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, Г. Пузыны, У. Сыракомлі, В. Каратынскага* ўказвае на важныя для творцаў каштоўнасці канструктыўнага характару ..." (с. 113). Паводле зместу дысертацыі, у раздзеле 3.5 *"Сэнсаўтваральны патэнцыял эмоцый у літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя"* дысертант даследуе сэнсаўтваральнасць эмоцый фактычна на матэрыяле мастацкіх тэкстаў паэмы *"Энеіда навыварат", Я. Чачота, А. Міцкевіча, Я. Анoшкі, У. Сыракомлі, В. Каратынскага* і не разглядае мастацкую спадчыну А. Петрашкевіча, Г. Пузыны. Таму лагічна прозвішчы гэтых пісьменнікаў не называць і пры падвядзенні вынікаў.

3. Аналітычны агляд па тэме бачыцца нам няпоўным, таму што ў ім адсутнічаюць манаграфіі В. Еўмянькова ("Адам Міцкевіч і духоўна-эстэтычныя пошукі ў літаратуры Беларусі XIX стагоддзя" (2009)), К. Лецкі ("Вытокі і генезіс беларускай літаратуры XIX стагоддзя" (2003)); І. Штэйнера "De profundis clamavi : Смех і роспач у нацыянальнай мастацкай традыцыі" (2003); або даследаванне: "Смехъ зъ болћстию смешанъ будеть: смехавыя традыцыі Рэнесансу ў сатырычнай літаратуры XX стагоддзя" (Гомель, 2017). Работы айчынных літаратуразнаўцаў маглі б стаць добрай асновай пры раскрыцці праблем "Духоўна-рэлігійных каштоўнасцей у эстэтычнай канцэпцыі пачынальнікаў" (Глава 3) і даследаванні "сэнсаўваўтваральнага патэнцыялу эмоцый" (Глава 3).

4. У аналітычным аглядзе па тэме нешматліка прадстаўлены акадэмічныя літаратуразнаўчыя даследаванні, такія як "Літаратуразнаўчы энцыклапедычны слоўнік" (М., 1987), або "Літаратурная энцыклапедыя сімвалаў і паняццяў" (М., 2001) (у бібліяграфічным спісе выкарыстаных крыніц называюцца толькі 3-ці том "Кароткай літаратурнай энцыклапедыі: у 9-ці т." (М., 1964) і "Паэтычны слоўнік" пад рэд. В. Рагойшы (Мн., 2004). Зварот да гэтых прац, па нашым меркаванні, абумоўлены задачай дысертацыйнага даследавання: "сістэматызаваць навуковыя канцэпцыі замежных і айчынных даследчыкаў пра эстэтычны ідэал з мэтай удакладніць найбольш важныя змястоўна-фармальныя складнікі дадзенай катэгорыі" (с. 6.).

5. Заўважаецца пэўная непрапарцыянальнасць дысертацыі: кампазіцыйна першая, другая і чацвёртая главы складаюцца з трох раздзелаў, а 3 глава – з шасці раздзелаў.

6. На с. 32 дысертацыі (Глава 2) рамантычная іронія вызначаецца як асноўны эстэтычны прынцып, як тып мастацкага мыслення і як асаблівая эстэтычная катэгорыя. Мы лічым правільнымі высновы Ж.В. Косцінай аб тым, што рамантычная іронія ўвабрала ў сябе сінтэз дзвюх непадобных,

супярэчлівых філасофскіх канцэпцый – нямецкай і англійскай. Нямецкія рамантыкі, на думку даследчыцы, прапагандавалі свабоду ў сабе, паэтызавалі суб'ектыўны свет, то англійскія рамантыкі былі адкрытыя сусвету, яны дзейнічалі ў аб'ектыўнай рэальнасці. Нельга пагадзіцца з адназначнасцю той заўвагі Ж.В. Косцінай, што першая больш уздзейнічала на творчасць Я. Баршчэўскага, а другая – на творчасць А. Міцкевіча.

Па-першае, сам Я. Баршчэўскі ў зборніку "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях" (Баршчэўскі, Я. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Я. Баршчэўскі ; пер. з пол. мовы, паслясл. і камент. М. В. Хаустовіча. – Мн., 1996. – 318 с.) адзначаў: "Я не пераймаю формаў, якія любілі пісьменнікі англійскія, нямецкія, або французскія, лічу, што чужаземнае не будзе пасаваць негаваркому жыхару Беларусі" (с. 81).

Па-другое, мы лічым, што дысертант няправільна выбрала вобраз шляхціца Завальні (зборнік Я. Баршчэўскага "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях") для доказнай ілюстрацыі свайго гіпатэтычнага бачання. На с. 36 дысертацыйнага даследавання саіскальнік адзначае, што "герой зборніка – шляхціц Завальня – чалавек без волі да дзеяння, якога задавальняе той маленькі свет, у якім жылі яго бацькі і будуць жыць яго сыны" (с. 36). Мы лічым, што Завальня, згодна з аўтарскай задумай, чалавек дзейсны, працавіты. Ён пакінуў бацькоўскі дом васямнаццацігадовым юнаком і стаў заможным гаспадаром, захавальнікам каштоўнасных арыенціраў, вызначальнымі сярод якіх з'яўляюцца добраўпарадкаванне зямлі, захаванне простанароднай мудрасці, прытоенай у міфалагічных апавяданнях і ў Біблейскіх тэкстах.

– У раздзеле 3.2. "Гісторыка-патрыятычная тэма ў святле эстэтычнага ідэалу" даследчык дакладна асвятляе ўзмацненне ідэй грамадзянскага патрыятызму як асноўнай эстэтычнай каштоўнасці таго часу ў творах пісьменнікаў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя, але пры гэтым парушаецца гісторыка-храналагічная паслядоўнасць. Ж.В. Косціна напачатку раздзела пільную ўвагу адводзіць разгляду гістарычных твораў Я. Чачота, Ю.І. Крашэўскага (40–50-х г.) (сс. 59, 60, 61 дысертацыі), а потым даследуе мастацкае выяўленне патрыятычных ідэй у творах філаматаў А. Петрашкевіча, М. Рукевіча, апелююча да іх мастацкіх твораў 1817, 1819 гг. (с. 63).

7. На сс. 11, 30 дысертацыйнага даследавання саіскальнік прыводзіць назву манаграфіі расійскіх даследчыкаў А. Лосева і В. Шастакова "Гісторыя эстэтычных катэгорый" і пазначае годам выдання 1965, а ў бібліяграфічным спісе яна пазначана 1964 г.;

– на с. 12 дысертацыі аўтар цытуе даследаванне Л. Сталовіча, якое змешчана ў тэксце раздзела пад нумарам 7, але пад гэтым нумарам у бібліяграфічным спісе змешчана работа М. Кагана;

– на с. 13 дысертант спасылаецца на работы М. Гея і У. Піскунова, пазначаючы ў дужках лічбу 13, але ў бібліяграфічным спісе пад гэтым нумарам змешчана прозвішча У.М. Конана;

– недакладна падаецца спасылка на артыкул А. Мальдзіса "Пад знакам народнасці і рамантызму". На с. 26 у тэксце дысертацыі адзначаецца, што артыкул А. Мальдзіса, на які і спасылаецца даследчык, змешчаны ў бібліяграфічным спісе пад нумарам 42, але фактычна ў спісе выкарыстаных крыніц пад гэтым нумарам прыводзіцца іншая праца А. Мальдзіса;

– на с. 26 дысертацыі Ж.В. Косціна прыводзіць цытату выказвання М. Хаўстовіча, пазначыўшы, што словы даследчыка цытуюцца са с. 1087, але ў бібліяграфічным спісе выкарыстаных крыніц падаецца інфармацыя, што ў гэтым выданні толькі 1086 с.;

– няправільна аформлена цытаванне і работы Ф. Крэйцэра "Сімволіка і міфалогія старажытных народаў", якая ў тэксце дысертацыі пазначана пад нумарам 28, а ў бібліяграфічным спісе пад гэтым нумарам прыводзіцца прозвішча С. Аверынцава.

8. У дысертацыйным даследаванні не ўніфікуецца напісанне імёнаў, прозвішчаў, ініцыялаў даследчыкаў, пісьменнікаў. Такое афармленне практыкуецца дысертантам на сс. 16, 17, 27, 28, 29, 30, 41, 58, 60 і інш. Аўтар навуковага даследавання часам не згадвае творы пісьменнікаў, у якіх ён вылучыў тыя ці іншыя рысы (с. 7 Палажэнне 2, с. 8 Палажэнне 3).

9. На с. 24 дысертацыі саіскальнік няправільна падае назву кнігі Я. Баршчэўскага "Шляхціц Завальня, ці Беларусь у фантастычных апавяданнях", правільна трэба: "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях"; на с. 36 дысертацыі Ж.В. Косціна двойчы недакладна падае жанравае вызначэнне кнігі Я. Баршчэўскага. Дысертант піша: «Прапануючы ў аповесці "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях…"», хаця пад такой назваю аповесці ў Я. Баршчэўскага няма, так называецца зборнік апавяданняў пісьменніка; недакладна пададзена і жанравае вызначэнне "Шчароўскіх дажынак" В. Дуніна-Марцінкевіча. Твор В. Дуніна-Марцінкевіча ў трактоўцы дысертанта – паэма (с. 22), але ж у падручніку па "Гісторыі беларускай літаратуры XI – XIX стагоддзяў" (Мн., 2007) гэты твор называецца вершаванай аповесцю (с. 215).

10. У дысертацыі сустракаюцца граматычныя, стылёвыя і сінтаксічныя памылкі на сс. 8, 20, 24, 30, 32, 33, 36, 37, 121, 123, 126 і інш., дапушчаны "тэхнічныя памылкі" пры афармленні спіса выкарыстаных крыніц у пунктах: 3, 11, 20, 22, 25, 27, 28, 31, 33, 37, 45, 51, 60, 63, 88, 134, 166 і інш.

Безумоўна, выказаных недахопаў пры больш уважлівым стаўленні дысертанта да тэксту дысертацыі магло не быць, бо ў цэлым дысертацыя засведчыла добрае валоданне матэрыялам даследавання, саіскальнік паказала дасведчанасць у гісторыі распрацоўкі праблемы, выявіла тэарэтыка-метадалагічную падрыхтаванасць да вырашэння пастаўленых у дысертацыйным даследаванні задач.

**5. Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе**

Дысертацыя Косцінай Жанны Вячаславаўны "Эстэтычны ідэал літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя" з'яўляецца актуальнай і

наватарскай. Яна выканана на належным тэарэтычным узроўні і дастаткова вялікім фактычным матэрыяле, мае лагічную структуру, характарызуецца належнай ступенню навуковай навізны, аргументаванасцю высноў і з'яўляецца самастойным завершаным даследаваннем.

Дысертацыя і аўтарэферат афармлены ў адпаведнасці з існуючымі патрабаваннямі, якія змяшчаюцца у пунктах 24-26 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь.

У адпаведнасці з патрабаваннямі пунктаў 18-20 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь Косціна Жанна Вячаславаўна заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура за сукупнасць наступных навуковых вынікаў:

– рэалізацыю комплекснага падыходу да раскрыцця эстэтычнага ідэалу літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя, зыходным момантам якога стала сістэматызацыя навуковых канцэпцый замежных і айчынных даследчыкаў пра эстэтычны ідэал, удакладненне найбольш важных змястоўна-фармальных складнікаў дадзенай катэгорыі і выпрацоўку ўласнага метадалагічнага шляху даследавання;

– вызначэнне спецыфічных праяў рамантычнай іроніі як эстэтычнага прынцыпу літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя, як тыпу мастацкага мыслення, для якога характэрны псеўдагістарычнае ўзнаўленне рэчаіснасці (Г. Мастоўская "Не заўсёды так робіцца, як гаворыцца"), сатырычнае апісанне вобразаў дзяржаўных кіраўнікоў і шляхты (Г. Жавускі "Успаміны сапліцы", І. Ходзька "Успаміны квестара");

– за выяўленне спосабаў рэпрэзентацыі эстэтычнага ідэалу літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя праз глыбокае даследаванне духоўна-рэлігійнай праблематыкі твораў Я. Чачота і В. Каратынскага, праз раскрыццё гісторыка-патрыятычнай тэмы ў творчасці філаматаў і філарэтаў, Ю. Крашэўскага, праз творчае ўспрыманне вобразаў шляхціца, селяніна і паэта ў мастацкім свеце А. Міцкевіча, В. Дуніна-Марцінкевіча, Я. Баршчэўскага;

– даследаванне дамінуючых жанраў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя (драматычных віншаванняў, літаратурных казак і песень) як стылістычных характарыстык эстэтычнага ідэалу і форм адлюстравання нацыянальнага жыцця.

У адпаведнасці з "Палажэннем аб прысуджэнні навуковых ступеняў і прысваенні вучоных званняў" Ж.В. Косціна выступіла з дакладам на пасяджэнні праблемнага савета БДПУ па філалагічных навуках па тэме дысертацыі, адказала зададзеныя пытанні.

Водзыў на дысертацыю Ж.В. Косцінай "Эстэтычны ідэал літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя", згодна з загадам рэктара БДПУ № 3342л ад 27 снежня 2024 г, быў абмеркаваны і зацверджаны на пасяджэнні праблемнага савета па філалагічных навуках БДПУ 20 студзеня 2025 г. (пратакол № 2 ад 20.01.2025).

Водзыў прыняты адкрытым галасаваннем, у якім прынялі ўдзел 10 чалавек (у тым ліку 3 дактары філалагічных навук, 7 кандыдатаў філалагічных навук).

Вынікі галасавання членаў праблемнага савета: за – 10, супраць – няма, устрымаліся – няма.

Старшыня праблемнага савета па філалагічных навуках БДПУ, доктар філалагічных наук, прафесар — В.Д.Старычонак

Сакратар праблемнага савета па філалагічных навуках БДПУ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт — Т.У.Рацько

Эксперт кандыдат філалагічных навук, дацэнт — Л.П.Леська

Подпіс Старычонка В.Д., Рацько Т.У., Леська Л.П.
намеснік начальніка АК БДПУ
С.Б. Пашкевіч
21.01.2025

Отзыв поступил в совет 21.01.2025 (Е.И. Борун)
З водзывам азнаёмлена 22.01.2025 Косуцкая Ю.